**Сцэнарый ранішніка “Мой першы сябар – Буквар”**

**Мэта:** правеядзенне забаўляльна-пазнавальнага мерапрыемства; абагульненне ведаў вучняў, атрыманых пры вывучэнні буквара.

**Прывітанне (спяваюць дзеці)**
Ці ўсе ёсць?
Вітаем вас!
Пачынаем, бо ўжо час.
Ёсць тут я, ёсць тут вы –
Раз! Два! Тры!

**Сцэнка**
**Аўтар**:
Лета песняй адзвінела –
Дзетвара за парты села.
Вочкі радасна гараць:
Дзетвара ўсё хоча знаць.
Вунь і Даша-вучаніца.
Ёй за партай не сядзіцца.
Яна ручку падымае
І ў настаўніцы пытае:
**Даша-вучаніца:**
- Ёсць у нас і дуб, і граб –
А які той баабаб?
А ці праўда, што жырафа
Вышынёй, як наша шафа?
**Аўтар:**
Потым трошкі памаўчала
І, падумаўшы, сказала:
**Даша-вучаніца:**
- Я магу вам адказаць,
Колькі будзе пяць і пяць.
А яшчэ магу таксама
Напісаць я слова «мама».
**Аўтар:**
Тут і Насця руку цягне.
**Насця:**
- Я ўмею ўжо чытаць...
Але ў вас хачу спытаць:
Праўда, што ў Сібіры цэлы год
Холад, снег і галалёд?
А ў Сахары сонца ззяе
І зімы там не бывае?
**Аўтар:**
Ім настаўніца ў адказ:
**Настаўніца:**
- Дзякуй вам! У добры час!

Адказаць на ўсе пытанні
Дапаможа вам старанне
І настойлівая праца.
За навуку будзем брацца!
**Настаўніца:**
*Дзеці, сёння ў нас незвычайны дзень. Мы перагарнулі апошнюю старонку Буквара. Закончаны першы падручнік.*
**1-ы вучань:** Першае слова — мама,
Першая кніга — Буквар.
Колькі яшчэ не сказана
І не спазнана шмат.
**2-і вучань:** Першыя перамогі
Жыцця адкрываюць абшар.
Першае слова — мама,
Першая кніга — Буквар!
**Хлопчык.**
Дзень святочны,незвычайны,
Клас аж зіхаціць святлом.
Мы сягоння адзначаем
Развітанне з Букваром.
**Дзяўчынка** (трымае ў руках Буквар).
Вось кніжка мая першая
З малюнкамі і вершамі.
Тут словы запаветныя —
І светлыя, і ветлыя.
Я з гэтай кніжкаю якраз
Прыйшла ў першы клас.
Як рада я сустрэчы з ёй —
З найпершай кніжкаю маёй!
І я крычу на ўвесь абшар:
— Буквар! Буквар! Буквар! Буквар! (В. Лукша, "Кніжка мая першая")
**Настаўніца:**
Па Буквары вы навучыліся чытаць, а значыць, перад вамі адкрыўся вялікі свет друкаванага слова. Газеты, часопісы, кнігі — усё гэта цяпер даступна вам. Вы сталі чытачамі — і гэта сапраўдная перамога. Умець чытаць — гэта вялікая справа. І я вас, мае маленькія сябры, віншую. Вы адкрылі для сябе дарогу ў багатае, вялікае і поўнае незвычайных адкрыццяў царства кніг.
Я не сумняваюся, ўрокі Буквара дзеці засвоілі выдатна. Яны ведаюць шмат беларускіх слоў і нават могуць расказаць, як узнікла наша родная мова.
**1- ы вучань** (трымае ў руках картку з пытальным знакам).
Ведаю, кожнае слова
Мае плоць і душу.
Як нараджалася мова,
На якой гавару
І пішу?
**2-і вучань** (трымае ў руках малюнкі птушак).
— Куку!..

— Віць-віць!.. —
Гэта зязюлі і ластаўкі
Прыляталі,
Каб слова Вось так,
Па складах, Ажывіць:
— Куку!..
— Віць-віць!..

**3-і вучань** (трымае ў руках некалькі каласкоў і лісточкаў).
Шолах калосся,
Шэпт лістападу
Дабаўлялі у слова
Па складу,
І яно,
Нарадзіўшыся ледзь,
Пачынала
Шаптаць,
Шапацець.

**4-ы вучань** (трымае ў руках карткі з выявамі маланкі і вадаспада).
Грому раскаты,
Гул вадаспада
Дабаўлялі у слова
Па складу,
І яно,
Нарадзіўшыся ледзь,
Пачынала
Грымець,
Грукацець.

**5-ы вучань** (трымае ў руках картку з выявай беларуса ў нацыянальным адзенні).
Потым у кожнае слова
Чалавек удыхнуў душу —
І нарадзілася мова,
На якой гавару
І пішу.

**Настаўніца:**
*Сапраўды, наша мова ўвабрала ў сябе ўсе гэтыя цудоўныя гукі. Яна — адлюстраванне нашай роднай зямлі, нашай Бацькаўшчыны.*

Цёплыя словы – сонца і хата,
Лепшыя словы – мама і тата.
Смачныя словы – хлеб і суніцы,
Росныя словы – кветкі, крыніца.
Даўнія словы - водгулле, род,
Родныя словы – край і народ!

**Вучні чытаюць:**

1. Мова родная мая ты,
   Што і дзедавай была!
   Мова мамы, мова таты,

Мова нашага сяла!

2. Ты звініш, калі я уранку
   Чую песні за акном,
   І журчыш, як баіць байку
   Мне бабуля перад сном.
3. Разгарну буквар вясёлы –
   Зноў са мной гаворыш ты,
   Мілагучная заўсёды,
   Як званочак залаты.
4. Спяём мы песню звонкую
   Пра родную старонку,
   Пра Беларусь радзімую –
   Цудоўную, адзіную. ("Бацькаўшчына", муз. В. Волах, сл. А. Касцецкага.)

**Настаўніца:**

*Беларуская мова вельмі мілагучная і красамоўная. А колькі ў яе скарбаў – прыказкі , прымаўкі, пацешкі, казкі, забаўлянкі, загадкі.*
*Давайце разам разгадаем некалькі загадак.*

1. За кругам робіць круг,
Садзіцца ён на луг.
Ні рук няма, ні лап,
А спрытна ловіць жаб. (Бусел.)

2. Чорныя, нямыя,
А як势 стануць радком,
Загавораць ладком. ( літары)

3. Што за птах
Зімой іскрыцца?
Не варона, не сініца...
Гэта полымем зары
Палымнеюць... (снегіры).

4. "Цар звяроў!" — яго завуць,
Хоць не страшны ён нічуць.
Я у цырку асмялеў
І сказаў: "Дзень добры... (леў)".

5. Баіцца ён, чырвоны,
На дол упасці з кроны,
Каб не паклаў у кошык
Яго ласунчык вожык. (Яблык.)

6. Малыя малышачкі
Носяць мёд на вышачкі. (пчолы)

7. Пчолкі белыя гуляюць,

Поле беллю пакрываюць.
Нібы з вулляў, ляцяць з хмар,
Засцілаючы абшар. (сняжынкі)

8. Сілу волата ён мае6
Дуб з карэннем падымае.
Барада і рогі ёсць,
Цар у пушчы ён – не госць. (зубр)

9. Яна — крыніца ведаў,
Яна — рэцэпт ад бедаў,
Ад невуцтва, ад ліха.
Скарынаўская... (кніга).

10. Быццам белы снег на дол,
Пакрывалам лёг на стол.
Рады госцю беларус,
Засцілаючы... (абрус).

**Настаўніца:**
*Нашы першакласнікі не толькі вывучылі літары, але ведаюць як называецца парадак, у якім яны размяшчаюцца. Гэта…*
**Дзеці:** Алфавіт
Дзеці спяваюць ( аўтары:. А. А. Гунько, Л. С. Сас)
**А, Б, В, Г,**
Дзяцел дзюбай дзёўб дубок.
Дзёўб, дзёўб пакуль не змок.
**Е, Ё, Ж,**
Зязюля звонка кукавала
Зялюля вусеняў знішчала.
**І, Й, К,**
Летам ластаўка лятала,
Лоўка мошачак глытала.
**М, Н, О,**
Прыляцела пліска.
Пырхнула разочак,
Села на пясочак.
**Р, С, Т,**
Узляцеў удод на плот.
Які ж прыгожы той удод.
**Ў, Ф, Х,**
Чапля ходзіць па лужку.
Жабкі туляцца ў траву.
**Ш, Ы, Ь, Э**
-Эму!
- У нас ён не жыве,
Алеж аб ім ведаем усе.

**Ю ,Я.**
Вось і ўся літараў сям'я!

**Настаўніца:**
*Вы не толькі добра вывучылі алфавіт, але і шмат ведаеце птушак, якія жывуць у нас на Беларусі. А аб чым спяваюць птушкі?*
*Птушыныя спевы. З. Аляксандрава*
Пяюць на дрэве салавей,
Малінаўка і дрозд:
"Ты гнёздаў нашых не чапай,
Не руш птушыных гнёзд!
І ведай: дрэвы ўсе і кветкі
Не перастаюць чакаць,
Калі малыя нашы дзеткі
Паціху запішчаць".
**Настаўніца:**
З дапамогай урокаў Буквара вы пазнаёміліся з правіламі паводзін у прыродзе. Я спадзяюся, што парушаць, гэтыя правілы, вы не будзеце.

**Жук і слімак. М. Танк**

(Інсцэніроўка)
Пагожым летнім ранкам
на лузе за сялом
сустрэўся жук аднойчы
з рагатым слімаком.
— Здарова! — жук вітае.
— Куды, браток, ідзеш
і з ракавіны хатку
нашто з сабой нясеш?
Абцёр слімак пот з твару,
гаворыць так жуку:
— Нямала пеpажыць мне
прыйшлося на вяку.
То сцюжа, то марозы,
то навальніца, дождж.
То часам у дарозе
захопіць змрок і ноч, —
шукай тады начлегу
пад нейкім там кустом...
Гавораць яны гэтак
і раптам чуюць — гром.
Ударыў дождж краплісты.
І жук пабег шукаць
дзе ў засені цяністай
шырокага лістка.
Але на цэлым лузе
няма страхі нідзе,
і мокры, ледзь жывы ён

да слімака ідзе.
— Пусці, браток, пагрэцца,
змок дужа на лугу,
насіць за гэта хатку
табе дапамагу.
У ракавіне шчыльнай
вандроўнікі сядзяць.
І нават дождж краплісты
не зможа іх дастаць.
Але мінулі хмары,
і сонца ўстала зноў,
жук хатку слімакову
пакінуў і пайшоў.
Забыўся пра нягоды,
і не наўме жуку,
што абяцаў паднесці
ён хату слімаку.

**Настаўніца:**

*За год мы навучыліся не толькі чытаць, пісаць, рашаць, але і адпачываць разам, дружна ўдзельнічаць у школьных святах, дапамагаць адзін аднаму. А якія мы гарэзы! Аб гэтым нашы прыпеўкі.*

Мы прыпеўкі праспяваем
Добрыя, не дрэнныя.
Не глядзіце так на нас,
Бо мы сарамлівыя.

Хлопцы нашыя ў спатрзале
Штодня сілу развівалі,
Каб дзяўчынак бараніць –
Камароў на іх пабіць!

У нашым класе не дзяўчынкі,
А адны красавіцы.
- Дзергану за коску Насцю,
- Ага, значыць падабаецца!

Прыпыніла Насця Даньку:
- Што носішсяўжо з ранку?
- А каму мяне насіць,
Хіба завуча прасіць?!

Лясны дзяцел клювам вострым
Доўбіць звонкую сасну
Паліна з Лідай на ўроку
Парушаюць цішыню.

Стас за ўсіх хутчэй бяжыць
І с’язджае з горкі,
А за партай ён дрыжыць
Нібы мышка ў норцы.

Наша Ліда не ціхоня,
Хоць і бачыцца такой.
Калі трэба – стукне смела
Кулаком, альбо нагой.

На ўроку напісала
Даша тэлеграму.
Наказалі вось Мікіту
І яе таксама!

Мы прыпеўкі праспявалі
Строга па парадку.
Калі з нас вы рагаталі
Пляскайце ў ладкі.

**Настаўніца:**
*Ох, і жвавыя вы, деткі. Сама не разумею, як я з вамі спраўляюся. Напэўна мне хтосьці дапамагае? Хто ж гэта?*
Дзеці: Ахоўнік класа – Жмяк.
Верш “Жмяк” (чытае вучаніца)

**1-ы вучань:** Як радасна ўмець чытаць!
Не трэба маму турбаваць,
Не трэба ўпрошваць і сястрычку:
“Ну, пачытай яшчэ хоць крышку!”
Не трэба клікаць і чакаць,
А можна ўзяць і пачытаць.

**2-і вучань:** Букварык родны, любы наш!
Расстацца нам прыйшоў ўжо час.
Літаратуру будзем мы любіць,
Але цябе нам не забыць!

**3-і вучань:** Зазелянела ўсё вакол,
І жаўрукі ўжо кружаць.
Вучні (усе разам).
Табе мы дзякуем, Буквар,
Бывай, наш добры дружа!

**Настаўніца:**
*Нашыя першакласнікі паказалі зусім не маленькі запас ведаў, атрыманых за год: чыталі вершы, спявалі песні, частушкі, адгадвалі загадкі.*

*Я віншую вас а святам! Цяпер для вас адкрытыя ўске кнігі, новыя веды. Жадаю вам прачытаць шмат цікавых, добрых кніг. Хай кніга стане для вас яркай зоркай у краіне ведаў. Я жадаю вам радасці! Жадаю не сумаваць! Мамаў, татаў, дзядуль і бабуль не турбаваць. І заўсёды прасіць прабачэння за любое сваё  парушэнне!*

*Слова вам, паважаныя бацькі.*

**Песня “Літарынка”**

**Настаўніца:**
*Наша свята падыйшло да завяршэння.*

*Дзякуй усім! Да пабачэння!*